СКАНВОРД



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Фламінга. Арляня. Лідар. Каша. Шпрыц. Рвач. Абжора. Шчара. Расол. Вобла. Чарка. Пяць. Бістро. Бар. Голуб. Баба. Заасад. Га. Дырэктар. **Па вертыкалі:** Кабой. Бігудзі. Базар. Бланк. Брага. Дар.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.06	17.39	8.33
Віцебск —	9.01	17.23	8.22
Магілёў —	8.56	17.29	8.33
Гомель —	8.47	17.32	8.45
Гродна —	9.20	17.55	8.35
Брэст —	9.15	18.01	8.46

Месяц

Першая квадра
25 студзеня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Елізара, Пятра, Якава.*
К. *Ванды, Палікарпа, Паўліны, Цімафея, Ціта.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

26 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1805 год — нарадзіўся (в. Прусы, цяпер у Салігорскім раёне) Яўстафій Янушкевіч. Працаваў адвакатам, сакратаром камісіі па спадчыне Радзівілаў. Адзін з арганізатараў паўстання 1830—1831 гадоў на тэрыторыі Ашмянскага, Слуцкага і Навагрудскага паветаў. Пасля паражэння паўстання эмігрыраваў у Францыю, удзельнічаў у арганізацыі выдання твораў А. Міцкевіча, З. Красінскага, І. Лялявеля. Памёр у 1874 годзе.

1918 год — нарадзіўся (в. Нязнань Клімавіцкага раёна) Іван Рыгоравіч Новікаў, беларускі пісьменнік, журналіст, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Дэбютаваў вершамі ў раённай газеце ў 1935 годзе. Прафесійную літаратурную працу пачаў з нарысаў. Першым значным творам была дакументальная аповесць «Сэрца інакш не можа» пра Веру Харужую. У 1959 годзе пачаў працаваць над кнігай «Руіны страляюць ва ўпор» — пра Мінскае падполле. Дакументальная аповесць вярнула з небыцця імёны герояў падполля, пяці з якіх пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, рэабілітаваны многія савецкія патрыёты. Далейшая распрацоўка гэтай тэмы знайшла працяг у дакументальных аповесцях «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску», «Да світання блізка», у гістарычных нарысах «Бяссмерце Мінска» і «Мінск — горад-герой». Выдаў нарысы «Палескае золата», «Побач сябры» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2001 годзе.

1938 год — нарадзіўся (в. Ходараўцы, цяпер у Лідскім раёне) Аляксандр Віктаравіч Шарапа, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Беларусі. Аўтар больш як ста навуковых публікацый, у тым ліку трох манаграфій, шэрагу навучальных дапаможнікаў.

У свеце

1878 год — падчас Руска-турэцкай вайны 1877—1878 гадоў упершыню ў гісторыі была паспяхова ўжыта тарпедная зброя. Катары «Чэсма» і «Сіноп» тарпедамі патапілі на рэйдзе Батумі турэцкі ўзброены параход «Інтыбах».

1924 год — на другім з'ездзе Саветаў Петраград пастанавілі назваць Ленінградам у мэтах увекавечання памяці правадыра пралетарыяту, заснавальніка і першага кіраўніка Савецкай дзяржавы. Прапанова аб перайменаванні, падтрыманая рэзалюцыямі працоўных усіх фабрык і заводаў Петраграда, паступіла ад Петраградскага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Гістарычная назва — Санкт-Пецярбург — вярнулася гораду ў 1991 годзе.

УСМІХНЕМСЯ

Казала ж мне ў дзяцінстве мама:

— Вова, цягні ноты! Не лянуйся!..

Я яе не паслухаўся. Цяпер цягаю піяніна.

Мы любім хадзіць у госці да Мішы і Наташы. У іх у доме заўсёды шмат настольных гульняў. З маіх любімых — партвейн.

— Ваш артыкул пра жанчыну, якая згубілася ў гарах і нічога не ела сорак дзён, выклікаў незвычайную цікавасць у чытачоў.

— Няўжо?

— Так, мы атрымалі ўжо каля сотні запытаў ад халастых шатландцаў, якія мараць ажаніцца з ёй.

Жанчына прыходзіць з мужам у ламбард:

— Мне трэба тысяча рублёў, вось мужыка ў вас як заклад пакіну.

— Грамадзянка, вы памыліліся адрасам! У нас тут каштоўнасці, золата.

— Пеця, адкрый рот!

Малюнак Аляксандра ШМІТА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 343. Нумар падпісаны ў 19.30 25 студзеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12